**Ю. Літвінковіч**

# ФРАЗЕЎТВАРАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ СЛОВА *МАЦІ* Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІНГВАКУЛЬТУРЫ

Канцэпт *маці* адносіцца да аднаго з найбольш значных канцэптаў любой культуры, паколькі *маці* з'яўляецца ключавой фігурай чалавечага быцця. З іншага боку, дадзены канцэпт знаходзіцца ў працэсе пераасэнсавання па меры ўзнікнення новых рэалій, у якія развіваюцца лінгвакультуры. Указаныя фактары надаюць яго даследаванню актуальнасць на кожным канкрэтным этапе гістарычнага развіцця чалавецтва.

Даследаванне лінгвакультурных канцэптаў мэтазгодна праводзіць на матэрыяле парэмій, якія ўяўляюць сабой універсальныя моўныя сродкі, што ў лаканічнай і выразнай форме адлюстроўваюць гісторыю народа.

Мэта даследавання – раскрыць фразеўтваральны патэнцыял слова *маці* ў беларускай лінгвакультуры. Аб'ектам даследавання з'явіліся беларускія парэміі, якія маюць у сваім складзе лексему *маці*. Фактычным матэрыялам паслужылі 79 парэміялагічных адзінак, выбраных з 4 фразеалагічных слоўнікаў.

Выбраны канцэпт рэпрэзентаваны словамі *матуля, мамка, матка, мама, мацер*.

Выяўлены наступныя канцэптуальныя прыметы, згодна з якімі *маці* паўстае перад намі як:

- даўца жыцця (*Успрымаць з малаком маці*);
- жанчына, якая выхавала (*Мацерына качалка лепш чужой ласкі*);
- аснова існавання і дабрабыту (*Зямелька – нас усіх маці: яна нас корміць, яна нас прыгорне*);
- вызначэнне маральнай якасці чалавека (*Сын к мацеры з галавешкаю, матка: «Сынок, ручкі папячэш»*);
- найбольш важная асоба ў жыцці (*Матчына малітва з дна мора дастане*);
- прыклад для наследавання (*Якая маці, такія дзеці*).

Варта адзначыць, што ў працэсе даследавання быў заўважаны выраз, які характарызуе старую маці як цяжар і непатрэбны клопат: *Хлеб не маці, не будзе касцей аб'ядаці.* Неабходна таксама падкрэсліць, што хоць гэта і адзіночны прыклад, дадзены погляд рэпрэзентаваны ў фальклоры, што звязана з вельмі старажытнымі ўяўленнямі нашых продкаў пра выжыванне ў цяжкіх умовах.

Такім чынам, намі быў выбраны корпус парэмій з лексемай *маці*, выяўлены семантычны аб'ём структуры дадзенага полісеманта і вылучаны 6 канцэптуальных прымет.

Перспектыва даследавання бачыцца нам у раскрыцці фразеўтваральнага патэнцыялу слова *маці* ў англійскай лінгвакультуры, што наблізіла б нас да

разумення дзвюх неблізкароднасных моў і народаў, а таксама ў далучэнні да фактычнага матэрыялу вуснай народнай творчасці, што дазволіла б больш шырока пранааналізаваць выбраны канцэпт.